**ЗАПАЗЫЧАННЕ** ў л і т а р а т у р ы, адна з форм літаратурных сувязей; выкарыстанне пэўным аўтарам ужо

вядомых матываў, сюжэтаў, вобразаў, характараў герояў, кампазіцыйных схем і інш. Аб'ектам творчага асэнсавання могуць быць фалькл., міфал. або літ. крыніцы. Так, для паэтаў 19 ст. характэрна З. сюжэтаў бел. легенд і паданняў. Напр., А.Міцкевіч, Я.Чачот і Т.Зан у якасці сюжэтнай асновы для сваіх балад выкарысталі легенду аб возеры Свіцязь. Класічным прыкладам З. з'яўляецца выкарыстанне вечных вобразаў (Дон Жуан, Праметэй, Мефістофель), вечных тэм (каханне, смерць, пошукі праўды), евангельскіх сюжэтаў, стылю («Апокрыф» М.Багдановіча). Пашыранай формай З. з'яўляецца перанясенне твора з аднаго літ. роду ў інш. (напр., інсцэніроўка «Навальніца будзе» А.Звонака паводле трылогіі Я.Коласа «На ростанях»). З. можа рэалізоўвацца таксама праз пародыю («Энеіда навыварат» В.Равінскага), стылізацыю (цыкл «Песні» М.Багдановіча), аплікацыю (верш «Светлай памяці Янкі Купалы» С.Ліхадзіеўскага). Новы твор, які з'яўляецца ў выніку З., хоць і захоўвае асн. рысы першакрыніцы, аднак заўсёды мае арыгінальны характар. У выпадку, калі аўтар творча не пераасэнсоўвае арыгінал, не змяняе яго маст. якасць, перад намі паўстаюць такія негатыўныя з'явы, як эпігонства або плагіят.

*В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова